пігментах, бруцэлёзе буйной рагатай жывёлы. Памёр 26.1.1990 г.

**БУХАВЕЦ Георгій Кліменцьевіч**. Савецкі ваенны дзеяч. Нарадзіўся 18.1.1901 г. Генерал-лейтэнант (1944). Скончыў Віцебскія пяхотныя камандныя курсы (1922), курсы «Выстрал» (1938), Вышэйшыя акадэмічныя курсы пры Ваеннай акадэміі Генштаба (1948). У Чырвонай Арміі з 1920 г. Удзельнік грамадзянскай вайны. З 1938 г. начальнік штаба стралковага корпуса. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на Паўночна-Заходнім, Ленінградскім, 3-м Беларускім, 1-м Украінскім франтах: начальнік штаба стралковага корпуса, камандзір дывізіі, начальнік штаба арміі. Да 1953 г. начальнік штаба ваенных акруг. Памёр 27.5.1967 г.

**ВАРАНЁНАК Яўген Якаўлевіч**. Вучоны-караблебудаўнік. Нарадзіўся ў 1937 г. Скончыў Ленінградскі караблебудаўнічы інстытут. Доктар тэхнічных навук. Прафесар. Аўтар больш як 80 навуковых прац, у тым ліку манаграфій, даведнікаў па будаўнічай механіцы карабля.

**ВАСІЛЬКОЎ Мікалай Карнілавіч**. Савецкі ваенны дзеяч. Нарадзіўся 6.5.1902 г. Генерал-лейтэнант артылерыі (1954). Скончыў Ваенна-тэхнічную акадэмію імя Дзяржынскага (1931). У Чырвонай Арміі з 1918 г. Удзельнік грамадзянскай вайны. У 1934—36 гг. выкладаў у Ваеннай артылерыйскай акадэміі імя Дзяржынскага. У Вялікую Айчынную вайну на Сталінградскім, Варонежскім, Цэнтральным, 1-м Украінскім, Паўднёвым, 1-м Беларускім франтах: камандзір асобнай брыгады, корпуса ППА. З 1945 г. на адказных пасадах у войсках ППА краіны. У 1959—62 гг. намеснік начальніка Ваеннай каманднай акадэміі ППА. Памёр 4.7.1973 г.

**ВЕЛІЧЭНКА Уладзімір Міхеевіч**. Нарадзіўся ў 1916 г. Скончыў Віцебскі медыцынскі інстытут (1940). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Пасля вайны працаваў загадчыкам раённага аддзела аховы здароўя, галоўным урачом Віцебскага абласнога анкалагічнага дыспансера. Заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1974). Аўтар 100 навуковых прац, у т.л. 3 манаграфій.

**ВОРАНАВА Аляксандра Іванаўна**. Беларускі гісторык. Нарадзілася 1.7.1908 г. Доктар гістарычных навук (1967). Прафесар (1968). Скончыла БДУ (1930). У 1933—44 гг. выкладала гісторыю СССР у ВНУ Мінска, Оршы, Уральска. З 1944 г. загадчык кафедры гісторыі СССР мінскіх педагагічнага інстытута і партыйнай школы; з 1962 г. на кафедры гісторыі СССР Мінскага педагагічнага інстытута. У яе працах раскрыта дынаміка фарміравання і развіцця фабрычна-заводскага пралетарыяту, ахарактарызаваны сацыяльна-эканамічныя прычыны і ўмовы, этапы і рост рабочага руху, асабліва ў перыяд рэвалюцыі 1905—07 гг., паказана дзейнасць першых сацыял-дэмакратычных груп на Беларусі ў канцы 19 — пачатку 20 ст. Аднак у даследаваннях А.І.Воранавай ідэалізаваліся рабочы рух і ступень бальшавіцкага кіраўніцтва ім, што было ўласціва гістарычнай навуцы таго часу. Памерла 26.11.1978 г.


А.В.Бонч-Асмалоўскі.


В.І.Гальданскі.

**ГАЛЬДАНСКІ Віталій Іосіфавіч**. Вучоны ў галіне хімічнай і ядзернай фізікі. Нарадзіўся 18.6.1923 г. Акадэмік Расійскай АН (1981, член-карэспандэнт 1962), член Нью-Йоркскай АН (1974), Германскай акадэміі прыродазнаўцаў «Леапальдзіна» (1976) і АН іншых краін. Доктар фізіка-матэматычных навук (1954), прафесар (1956). Скончыў Маскоўскі універсітэт (1944). У 1942—52 гг. і з 1961 г. ў Інстытуце хімічнай фізікі Расійскай АН (з 1971 загадчык аддзела, з 1988 дырэктар). Адначасова ў 1951—75 гг. і з 1981 г. ў Маскоўскім інжынерна-фізічным інстытуце, у 1975—81 гг. загадчык кафедры Маскоўскага інстытута тонкай хімічнай тэхналогіі. Галоўны рэдактар часопісаў АН «Химия высоких энергий»(1967—87) і «Химическая физика» (з 1987). Навуковыя працы па фізіцы атамнага ядра і элементарных часціц, ядзернай хіміі, хіміі высокіх энергій і нізкіх тэмператур, квантавай хімічнай кінетыцы, біяхімічнай фізіцы. Адкрыў двухнуклонную радыеактыўнасць атамных ядзер (1960; эфект